# РАЗУМЕННЕ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ МЕРАБАМ МАМАРДАШВІЛІ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ

**Кунцэвіч Яўген Сяргеевіч**
студэнт аддзялення філасофіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

***Анатацыя***. *Аналізуюцца антрапалагічныя погляды М. Мамардашвілі, заснаваныя на ўяўленні пра прынцыповую нясконченасць чалавека і неабходнасць пастаяннага, працяглага намагання для таго, каб станавіцца самім сабой ды пацвярджаць свой чалавечы статус, і на адпаведным уяўленні пра жыццё як «намаганне ў часе». Апошнія бяруць свой пачатак у эпосе Адраджэння, калі еўрапейскі чалавек зрабіўся «незваротна сучасным» праз вяртанне публічнай і прававой культуры Антычнасці і евангельскага «ўнутранага голасу», які арыентаваў намаганні чалавека, адхіляючы ад шкоднай дзейнасці і скіроўваючы да станаўлення самім сабой. Ва ўмовах савецкага грамадства для М. Мамардашвілі ўзорам асяроддзя, у якім чалавек мог бы ажыццявіць сябе, выступае грамадзянская супольнасць і само ўяўленне пра грамадзянскасць (цывілізаванасць). На думку М. Мамардашвілі, сучасная грамадзянская супольнасць мусіць грунтавацца на чатырох прынцыпах: канструктыўнай звязнасці, аб’ектывацыі, зразумеласці ды неабходнасці працы. Пры гэтым уздым нацыянальных рухаў з’яўляецца неабходнай умовай і пэўным індыкатарам актывізацыі працэсаў арганізацыі грамадзянскай супольнасці, але толькі ў тым выпадку, калі гэтым рухам не чужыя ідэі сталення чалавека і грамадства.*

***Ключавыя словы***: *грамадзянская супольнасць; намаганне станавіцца чалавекам; канструктыўная звязнасць; аб’ектывацыя; зразумеласць; неабходнасць працы; нацыянальнае развіццё.*

## M. MAMARDASHVILI’S CONCEPTION OF CIVIL SOCIETY AND NATIONAL DEVELOPMENT

**Kuncevič Jaŭhien Siarhiejevič**
Student, Department of Philosophy, Faculty of Philosophy and Social Sciences
Belarusian State University

***Abstract***. *The article analyzes M. Mamardashvili's anthropological views, based on the idea of the fundamental incompleteness of human and the need for a constant, long-term effort to become himself and confirm his human status, and on the corresponding idea of life as «effort in time». It refers to the Renaissance, when European human became «irrevocably modern» by the return of the public and legal culture of Antiquity and the evangelical*

*«internal voice», which oriented the efforts of human, removing him from harmful activities and directing him to become himself. In the conditions of Soviet society, for M. Mamardashvili, the model of the environment in which a human could realize himself as a human is civil society and the idea of civility. According to M. Mamardashvili, modern civil society should be based on four principles: constructive connectivity, objectification, understandability and the need to work. At the same time, the rise of national movements is a necessary condition and a certain indicator of the activation of civil society organization processes, but only if these movements are not alien to the ideas of growing of a person and society.*

***Keywords**: civil society; effort to become a human; constructive connectivity; objectification; understandability; the need to work; national development.*

Для таго каб правільна зразумець канцэпцыю грамадзянскай супольнасці М. Мамардашвілі, трэба найперш коратка разабраць яго антрапалагічныя ідэі, паколькі яны ёсць адказам на пытанне, *хто* мусіць ствараць градзянскую супольнасць і *каму* яна патрэбная. Мамардашвіліева філасофія чалавека – гэта картэзіянская філасофія бесперапыннага стварэння, і чалавек у ёй – гэта «распаўсюджанае ў часе намаганне, пастаяннае намаганне стаць чалавекам» [1, с. 26], гэта не ад нараджэння дадзены стан, а стан, які ствараецца несупынна і пацвярджаецца самім намаганнем стварыць яго. Само жыццё тады вызначаецца як «намаганне ў часе». Еўропа, паводле М. Мамардашвілі, нясе ў сабе такую самую сутнасную рысу: «… у Еўропы няма ўзросту, яна заўсёды ў стане нараджэння» [1, с. 26]. *Адказнасць* еўрапейскага чалавека і самой Еўропы – у тым, каб пастаянна падтрымліваць гэты стан саманараджэння, самастварэння. М. Мамардашвілі падкрэслівае, што звязвае культуру, цывілізаванасць са здольнасцю, можаннем *практыкаваць* усю разнастайнасць жыцця, дадзенага культурай [1, с. 27]. Чалавек робіцца культурным, калі жыве складана і разнастайна, як гэта дазваляе культура.

Вытокі сучаснага стану рэчаў неабходна шукаць у эпосе Адраджэння, калі да жыцця вярнуліся два элементы – і «мы сталі незваротна сучаснымі» [1, с. 27]. Першы з гэтых элементаў – грэцка-рымскі свет, складзены з грэцкай поліснай культуры і рымскай культуры прававой дзяржавы. Другі з адроджаных элементаў – гэта евангельская ідэя «ўнутранага голасу» (сумлення), які прысутнічае ў чалавеку і незалежна ад знешніх абставінаў дазваляе яму, з аднаго боку, станавіцца самім сабой, а з іншага – дзейнічаць *гістарычна*. Адраджэнне гэтых двух элементаў грунтавала станаўленне грамадзянскай супольнасці – складанага

сацыяльнага і гістарычнага цела чалавека, якое характарызуе яго даросласць.

Для правільнага разумення ролі грамадзянскай супольнасці ў жыцці чалавека, М. Мамардашвілі прапануе арыентавацца на чатыры прынцыпы: канструктыўнай звязнасці, аб’ектывацыі, зразумеласці і неабходнасці працы [3, с. 61–62]. Чалавек не можа рэалізаваць сябе цалкам, зыходзячы толькі з самога сябе, паколькі існуюць рэчы, немажлівыя без наяўнасці сацыяльных органаў. Грамадзянская супольнасць мусіць быць сістэмаю сацыяльных канструкцыяў, прызначаных для поўнага самаажыццяўлення чалавека. Для гэтага грамадзянская супольнасць мусіць быць *звязнай канструкцыяй*, жывым асяроддзем свабодных грамадзянаў, якія *становяцца людзьмі*.

Мажлівасць аб’ектывацыі азначае, што ў канструктыўна звязанай сацыяльнай рэальнасці могуць выявіцца і атрымаць сваё завяршэнне *ўсе* чалавечыя станы. У знешняй публічнай прасторы мусяць існаваць такія сацыяльныя канструкцыі, каб *усё* тое, што ёсць у чалавеку, магло атрымаць у іх «цямнасць і форму», а не заставалася ў «вобласці недараджэнняў, інкубальнай, скажам так, вобласці недаіснавання, недадумання, недапачуццяў» [3, с. 61]. Чалавек можа пастаянна падтрымліваць намаганне станавіцца сабой, толькі калі мае вакол сябе дастаткова развіты і структураваны сацыяльны арганізм, у якім знойдзецца своеасаблівы орган, каб аб’ектываваць любое ўнутранае і даажыццявіць яго ў сферы, якая дазваляе звязную камунікацыю з іншымі людзьмі праз мову.

Аднак мова – знешняе выяўленне індывідуальнага разумення кожнага чалавека. Без гэтага разумення немажлівы ніводны сэнс і яго існаванне ў сацыяльнай прасторы. Адно і тое ж слова можа мець некалькі значэнняў, напрыклад, распаўсюджанае праз ідэалогію і – *іншае*, сапраўднае: справядлівасць. На моўным узроўні іх адрозніць нельга, як нельга адрозніць моўна пастух (чаго?) быцця і пастух (чый? каму належыць?) быцця – гэта можна толькі *зразумець*. Прынцып зразумеласці заключаецца ў тып, што канструкцыі грамадзянскай супольнасці мусяць *паддавацца* разуменню, г. зн. сыходзіць глыбей за словы.

І апошні прынцып неабходнасці працы азначае, што ў сітуацыі, калі ёсць унутраныя станы, якія патрабуюць аб’ектывацыі, і калі ёсць сацыяльныя органы, якія могуць яе забяспечыць – у гэтай сітуацыі галоўным усё роўна застаецца намаганне, чалавечая праца, каб станавіцца чалавекам, самаажыццяўляцца. Ёсць анталагічны закон: паміж унутраным і знешнім існуе люфт, прагал, які можна пераадолець выключна чалавечай

працай. Добры намер не робіцца дабром у знешняй прасторы сам па сабе – для гэтага заўсёды патрабуецца *той, хто* прыйдзе і зробіць дабро.

Грамадзянская супольнасць у разуменні М. Мамардашвілі ўяўляе сабою нашмат глыбейшае ўтварэнне, чым прынята лічыць, і ёсць, па сутнасці, сінонімам цывілізацыі, цывілізаванасці як грамадзянскасці – супольнасці свабодных і роўных людзей, якія прыкладаюць намаганні, каб станавіцца людзьмі. Трэба заўважыць, што час, калі М. Мамардашвілі фармуляваў свае сацыяльна-філасофскія погляды (1980-я гг.), характарызаваўся нацыянальным уздымам у савецкіх рэспубліках. Калі ўспомніць, што *ўсе* станы чалавека, у тым ліку і ўсе яго ідэнтычнасці мусяць мець магчымасць атрымаць форму і завяршыцца праз аб’ектывацыю ў сацыяльным, то нацыянальнасць, безумоўна, павінна мець *свае* канструкцыі, каб увасобіцца ў межах грамадзянскай супольнасці.

Грамадзянская супольнасць не можа быць поўнай без нацыянальных інстытуцыяў, нацыянальныя органы сацыяльнага цела, якія дазваляюць выводзіць нацыянальную ідэнтычнасць са стану «неда-» і да-думаць, да-адчуць – і стаць паўнапраўным носьбітам гэтай ідэнтычнасці, носяць неабходны характар. Аднак не наадварот: не любое нацыянальнае развіццё звязана са станаўленнем грамадзянскай супольнасці, г. зн. вядзе да стану дарослаcці грамадства. Толькі нацыянальны ўздым, які ўсведамляе ідэю дарослаcці і прынцыпы грамадзянскай супольнасці, можа лічыцца індыкатарам яе нараджэння. Толькі нацыянальнае вызваленне, якое ведае мэты грамадскага сталення – гэта «форма, якая вядзе да нараджэння грамадзянскай супольнасці» [2, с. 225]. І, нарадзіўшыся ў форме нацыянальнага развіцця, грамадзянская супольнасць можа забяспечваць сацыяльнымі канструкцыямі як нацыянальныя ідэнтычнасці, гэтак і астатнія станы, пачуцці і думкі чалавека.

**Спіс літаратуры**

1. Мамардашвили, М. К. Европейская ответственность / М. К. Мамардашвили // Сознание и цивилизация / М. К. Мамардашвили. – М., 2004. – С. 26–29.

2. Мамардашвили, М. К. Жизнь шпиона / М. К. Мамардашвили // Сознание и цивилизация / М. К. Мамардашвили. – М., 2004. – С. 217–234.

3. Мамардашвили, М. К. О гражданском обществе / М. К. Мамардашвили // Сознание и цивилизация / М. К. Мамардашвили. – М., 2004. – С. 54–84.

**References**

1. Mamardashvili, M. K. [European Responsibility] / by M. K. Mamardashvili // Consciousness and civilization / M. K. Mamardashvili. – M., 2004. – P. 26–29. [in Russ.]

2. Mamardashvili, M. K. [Spy’s Life] / by M. K. Mamardashvili // Consciousness and civilization / M. K. Mamardashvili. – M., 2004. – P. 217–234. [in Russ.]

3. Mamardashvili, M. K. [On Civil Society] / by M. K. Mamardashvili // Consciousness and civilization / M. K. Mamardashvili. – M., 2004. – P. 54–84. [in Russ.]